венерических заболеваний на территории советского союза с помощью жесткого контроля за источниками заражения и принудительного лечения больных.

***Литература***

1. Венерические заболевания в Великую Отечественную войну [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://kamen-jahr.livejournal.com/206935.html. – Дата доступа: 16.03.2019.
2. Дерматовенерология в годы великой отечественной войны [Электронный ресурс]. – Режим доступа:http://www.irbis-nbuv.gov.ua/cgi. – Дата доступа: 16.03.2019.

***Верабей Вікторыя Аляксандраўна***

## РАССТРЭЛЫ І МАСАВЫЯ ЭКЗЭКУЦЫІ МІРНАГА НАСЕЛЬНІЦТВА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРЫЯД ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
Кафедра сацыяльна-гуманітарных навук

Навуковы кіраўнік кафедры сацыяльна-гуманітарных навук,
к.г.н. Сіткевіч С.А.

Войны – час, калі ў людзях прачынаецца, часам, усё самае цёмнае і жорсткае, што ёсць у чалавечай натуры. Чытаючы ўспаміны відавочнікаў падзей Другой сусветнай вайны, знаёмячыся з дакументамі, проста дзівішся людскай жорсткасці, якая ў той перыяд, падобна, проста не ведала меж. І гаворка ідзе не пра баявыя дзеянні, вайна ёсць вайна. Гаворка пра катаванні і пакаранні смерцю, якія ўжываліся да ваеннапалонных і нават да грамадзянскаму насельніцтву.

На тэрыторыі Беларусі немцы практыкавалі спаленне жыўцом цэлых вёсак. Сярод мноства такіх выпадкаў на тэрыторыі СССР самым знакамітым стала спаленне жыўцом 149 жыхароў беларускай вёскі Хатынь, палову з якіх складалі дзеці да 16.

Таксама былі выпадкі, калі кідалі ў ямы і засыналі зямлёй яшчэ жывых людзей. Але і гэта цьмянее ў параўнанні з выпадкамі, калі немцы падыходзілі да задачы асабліва «творча».



Репозиторий ГрГМУ

Вядома, што ў канцлагеры Трэблінка дзвюх дзяўчын, удзельніц Супрацiву, сварылі жыўцом у бочцы з вадой. На фронце салдатня забаўлялася, раздзіраючы палонных, прывязаных да танкаў.

Маіх продкаў таксама кранула гэтая няшцасце. … Калі майму дзеду, Верабей Генадзь Міхайлавіч, было дванаццаць гадоў ў іх вёсцы, Галылнка (Зельвенскі раён), немцы падверглі мірнае насельніцтва массаваму пакаранню смерцю

У той дзень, дваццаць першага снежня 1942 года, дзеці (дзед з двума суседскімі хлопчыкамі) каталіся на возеры. Як толькі заўважылі немцаў, якія акружалі «ланцугом» вёску, падлеткі хуценька накіраваліся ў хату да майго дзеда. Яны добра ведалі загад немцаў: падчас праверкі неабходна было быць дома, бо адсутнага па нейкіх прычынах члена сям'і лічілы партызанам, і тады за гэта маглі знішчыць ўсю сям'ю. Дома ўжо сабралася ўся сям'я: мой прадзед Верабей Міхаіл Максімавіч, прабабуля Верабей Вера Аўтонаўна, дзве сястры майго дзядулі, Рая і Галя, і малодшы брат Георгій. Калі на парозе з'явіўся нямецкі салдат, прабабуля папрасіла дазволіць ёй загнаць у хлеў карову. На што фашыст па-польску сказаў, што яна ўжо сям'і не спатрэбіцца. Стала адразу зразумела, што іх чакае не звычайная праверка, а штосьці больш страшнае. Немцы вывялі сям'ю і двух суседскіх хлопчыкаў на вуліцу, выстраілі паміж хатай і хлявом. Пачуліся стрэлы. Генадзь, мой дзед, не паспеў адчуць ні болю, ні жаху. Апрытомнеў толькі праз нейкі час ад моцнага холаду, заварушыўся. Жывымі засталіся Рая, Галя і старэйшы суседскі хлопец Здзісек. З усіх іх найгорш было дзеду: ён быў паранены ў шыю і спіну, сцякаў кроўю. Так у адзін момант яны засталіся без бацькоў. Было балюча, страшна, а яшчэ вельмі хацелася жыць. Вырашылі выбірацца з вёскі і шукаць сваякоў у Дзярэчыне. Толькі рушылі, як зноў пачуліся галасы немцаў. Дзеці хутка вярнуліся да забітых і леглі ў акрываўлены снег. Фашысты праверылі, ці ўсе на месцы, а пасля, заглянуўшы ў хату, зноў кудысьці пайшлі (зніклі). Дзеці паўставалі, было зразумела, што ў светлы час сутак ім адсюль не выбрацца. Сталі хавацца на месцы: суседскі хлопец- паляк Здзісек – пад сена, Генадзь – у ямку каля дрэва, дзяўчаты – у склеп. Немцы прыходзілі зноў і зноў, але, на шчасце, да забітых больш не праяўлялі цікавасці,

Репозиторий ГрГМУ

увесь час штосьці выносілі з хаты. Нарэшце, калі сцямнела, дзеці пачалі выбірацца са сваіх сховішчаў. Але цяпер ужо трое з іх, Здзісек, Рая і Галя, накіраваліся ў суседнюю вёску Клімавічы, дзе іх пад пагрозай смерці пакінулі начаваць у сваім доме зусім ім чужыя людзі – сям'я Бітук. А Генадзь, цяжка паранены, перабраўшыся праз замерзлую рэчку, дабрыў да дома аднавяскоўцаў Чэчэтаў, якія, аднак, пабаяліся яго пусціць да сябе і накіравалі падлетка да яго цёткі. Хлопчыку яшчэ доўга давялося хадзіць па начной вуліцы, пакуль ён знайшоў сваіх сваякоў разам з іншымі спужанымі аднавяскоўцамі ў хляве Ракевічаў. Падчас сумеснай для ўцалелых жыхароў вёскі Галынка начоўкі Генадзя пачало ліхаманіць (трасці) ад холада і страты крыві. Цётка Яўгенія павымала, дзе магла, асколкі ад куль,дробязныя часткі патрушчаных касцей і перавязала раны падлетка. Раніцай стала зразумела, што сваімі сіламі хлопцу не дапамагчы. І тады дзядзька Павел і яго жонка Соня Лявіцкія, пакінуўшы ўласных дзяцей з незамужняй цёткай Яўгеніяй, вырашылі везці пляменніка ў Дзярэчын. У гэты час прыйшлі з Клімавіч Рая і Галя, якіх таксама ўзялі з сабой. У Дзярэчыне жыў яшчэ ядзін родны дзядзька дзяцей – Олесь, які і дамовіўся з урачом з нямецкага шпіталя аб дапамозе раненаму. Доктар дастаў асколкі ад разрыўных куль, але не ўсе. Напужаны апошнімі падзеямі, Генадзь не дазволіў дакрануцца да шыі. Толькі праз некалькі гадоў куля, на шчасце, сама выйшла адтуль. А асколкі куль у лёгкіх так і суправаджаюць дзядулю ўсё яго жыццё, памяншаючы іх памер з кожным годам… А дзяцей тады сваякі размеркавалі ў розныя сем'і: Рая засталася ў Дзярэчыне з дзядзькам Олесем, Галя паехала ў вёску Азёркі да цёткі сваёй матулі, а Генадзь, падлечаны ўрачом, рос у сям'і Паўла і Соні Лявіцкіх…

Усе гэтыя факты сведчаць пра наяўнасць зверскага крывавага рэжыму, які панаваў на тэрыторыі Беларусі падчас Вялікай Айчынай вайны. Менавіта гэта падкрэслівае і гісторыя маўй сям'і.

***Спіс літаратуры:***

1. Какие казни во время Второй Мировой были самые жестокие [Электронны рэсурс]. – Электронныя данныя – Мінск, 2017 – Рэжым доступу: www.agtu.ru/fad08f5ab5ca9486942a52596ba6582elit.html.



Репозиторий ГрГМУ